Пушчалюб: 188 тысяч кубаметраў / 10 гадоў складае 18,8 тыс. кубаметраў у год. Пушча гэта тры надлясніцтвы. Выкажам здагадку, што адно надлясніцтва гэта каля 12 тысяч гектараў. Дзялю масу 18800 кубаметраў / 36000 га, атрымаем 0,52 кубаметр на гектар. Паколькі шмат дрэў у Пушчы мае масу значна большую чым 1 кубаметр, то лёгка зразумець, што гаворка ідзе пра адно дрэва на паверхні 100 х 100 метраў. Давайце не будзем сходзіць з розуму перад эколагамі. Яны спасылаюцца на вялікія лічбы, але хаваюць, што гаворка пра яшчэ большыя плошчы лесу. Выдаленне аднаго дрэва не парушыць структуру пушчы і не прывядзе да яе смерці. А гэтае дрэва на чыюсьці галаву не зваліцца...

Бэка з экалё: Як можна адмаўляць сваю ўласную логіку? Калі сып яловага караеда з'яўляецца натуральным і не зжарэ ён усяе Пушчы, то пэўна няма ніякага парніковага эфекту. А калі ёсць парніковы эфект і ненатуральны сып таго ж караеда спусташае лясы халоднай Канады з-за пацяплення, то можа трэба падтрымаць гэтага брыдкага, злога як воўк з сінімі ікламі паскуду з ПіС, які стаіць у абароне лесу.

Нармалька: Экатэрарысты лётаюць па дапамогу да экалагічнага ЕС. Калі ласка, спытайце ў еўрабюракратаў: а **дзе вашы лясы** і пушчы? Калі пакажуць нам, што маюць яны старэйшыя, дагледжаныя раёны дзікай прыроды лепшыя чым у нас, то можа прыслухаемся да іх парад, але мне здаецца, што дома яны ўсё разбурылі і забетанавалі, а цяпер хочуць нас навучаць.

Дзякую за ўвагу: Пасля таго, як ад маёй бабулі дастаўся мне ў 2011 годзе лес, ляснічы сказаў, што я павінен ссякчы 32 дрэвы (караед!). Я не паслухаўся, і ў 2014 годзе мусіў іх выразаць 87.

Сьверк: Загнаць усю гэта мудрагелістую кампанію працаваць у ляснoй гаспадарцы. Гумавыя чобаты, плашчы ад кляшчоў – і ў лес! Вучыць, дзе бяроза, дзе хвоя, дзе дуб. Пакуль яны – вялікая «ліпа»..

Моніка: Палякі маюць найлепшых леснікоў у Еўропе. Польская лясная гаспадарка заўсёды была на самым высокім узроўні. Што можа ведаць аб гэтым еўрапейская бюракратыя, калі яны не адрозніваюць паміж рыбай і слімаком, а думаюць што морква гэта садавіна. Верагодна, пушча для іх – як поле кукурузы. І ці яны калі-небудзь бачылі гэтую пушчу? 3/4 дрэў памерла з-за караеда. Сама пушча не абароніцца, а калі не вывезуць хворых дрэў, то ў хуткім часе застануцца толькі пнянькі.

Міраслаў Скепка: Усе гэтыя арганізацыі трэба разлічыць за падбухторванне да знішчэння Белавежскай пушчы. Што зараз можна ўбачыць у пушчы, кліча пра помсту з неба! Гэты генацыд лесу можна параўнаць толькі да генацыду габрэяў.

Міра Лукша ■

Dwie drogi Sokólszczyzny

„Światopogląd jednostki w warunkach rozpadu społeczności tradycyjnej" Włodzimierza Pawluczuka to jedna z najważniejszych książek, pozwalających zagłębić się w świat problemów tożsamościowych Białorusinów Podlasia w wieku XX. Opisany przez autora dawny system wartości, oparty na niezmienności pracy w równie niezmiennym środowisku żywym i nieożywionym, został wszak bezpowrotnie utracony. Stanowił punkt wyjścia do wkroczenia w nowoczesność, gdzie jednostka decyduje o sobie w stopniu o wiele większym niż w silnie wiążących z sobą małych, autarkicznych grupach. Wtedy na dobre rozchodzić zaczęły się drogi przyszłych sokólskich Polaków i takich jak oni ich prawosławnych sąsiadów.

Na pewno niezastąpioną krynicą wiedzy dla każdego zainteresowanego będzie tu także wielotomowy „Lud białoruski na Rusi Litewskiej: materyały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877-1905" Michała Fedorowskiego, z jakiego korzystał również Pawluczuk. Materiał obu prac pozwala rozumieć procesy, do jakich z jednej strony doprowadziły wieloletnie zmiany świadomości społeczności katolickiej i prawosławnej, ale i ciąg niesprzyjających wydarzeń ponad ich głowami.

Bo właśnie efektem późniejszych, jakże licznych w wieku XX, dziejowych zawieruch jest to, że dziś białoruska mniejszość w Polsce bije się o przetrwanie wyłącznie w powiatach siemiatyckim, białostockim, bielskim i przede wszystkim hajnowskim. Na północ od Białegostoku bitwa o białoruską tożsamość wśród katolików została już dawno przegrana. Co do tego doprowadziło? Poniżej postaram się przedstawić najważniejsze z przyczyn, zaś pisząc o tytułowej Sokólszczyźnie mam na myśli z grubsza tereny dzisiejszego powiatu sokólskiego.

Zacznijmy od pewnego oczywistego faktu. Podlasie leży na peryferiach białoruskiego (a ukraińskiego w stopniu o wiele większym) centrum życia narodowego, a jednocześnie całkiem blisko silnego żywiołu polskiego. Rzutowało to na ruską ludność tych ziem od bardzo dawna. To jednak nie tłumaczy ostatecznie losów terenów położonych nieopodal Grodna i odwiecznie z nim związanych (Dąbrowa, Sidra). W książce Michała Fedorowskiego znajdziemy sporo cytatów z tych zakątków ziem białoruskich, które znalazły się w późniejszej Republice Białoruś. Ale znajdziemy w niej też niemało białoruskiego świadectwa z terenów dzisiejszego polskiego województwa. Mnie szczególnie zainteresowały rozmowy z mieszkańcami wsi Dryha (Dryga) i Chodorówka (Nowa, Stara) w gminie Suchowola. Widać w nich już chociażby ewidentny wpływ języka polskiego. Od „Mazurów" przejmowano „teraz", a wyrzucano „kali", przejmowano „co" a zarzucano używanie „szto". Działo się to bezwiednie i płynnie dziesiątki lat, co uwidacznia porównanie przykładów gwarowych z okolic Lidy czy Świsłoczy z tymi spod Sokółki. Oto jeden z tekstów mieszkanki Drygi, Pauliny Dzieżko, spisany ok. 140 lat temu przez Federowskiego: *Jednaho razu chłopcy zrabili zakład: jedzin każa że pojdzie u nacze na mahiłki. Pryniesie kuostku czaławieczu i nazad na toje samo miesco odniesie. – Nu dobro! Paszou juon a dwanastoj, prynios i pakazau a jeny każuć: „Nu to adniesi teraz nazad". Juon panuos a jeny nie wieryli, da to paszli nahledam za im. Tak juon zanuos na miesco, aż u tom mamenci jak zrobicie bura, usie kryże pahililisie, mahiły u haru papadnimalisie i taja kuostka zrobiłasie wielka i u haru padniałasie. Tak to juon zawiernuusie, da u nohi z mahiłak i potym z pierepałachu chwareu douho, co aż mało nie umior. Ot jak zakład na licho wywiou.*

Co innego treść wywiadów. Świat starodawnych podań, legend pełnych przestróg, istot nadprzyrodzonych, mitów, nieboszczyków, pojawiających się między nami i doradzających z zaświatów, to coś wspólnego dla ruskiego (i nie tylko) obszaru et-

nograficznego w II połowie XIX wieku bez względu na wyznawaną religię. Pawluczuk, w „Światopoglądzie jednostki…” porównujący katolików z prawosławnymi, zwraca jednak uwagę, że na wsiach katolickich daleko bardziej znacząca była rola Kościoła. Tym większa, im bliżej przełomowego wieku XX. Badacze Sokólszczyzny lat późniejszych, a wciąż jeszcze przed I wojną światową, wskazywali, iż miejscowi katolicy utracili niemal całą spuściznę ludową, jaką Michałowi Fedorowskiemu jeszcze udało się liznąć. Rzecz niepojęta z dłuższej perspektywy historycznej, ale niestety smutnie prawdziwa. Co w zamian? Ostateczne przechodzenie w świat ludowej, nieraz koślawej, niepełnej, ale jednak jednoznacznie katolickiej religijności, łączonej później w oczywisty sposób z polskością. A Kościół rzymskokatolicki poza promowaniem języka polskiego kładł też mocny nacisk na przekazanie słowa Bożego w duchu jedynej i nie współdzielonej z niczym innym prawdy. Tam samym tępił wszystko, co poczytywał za gusła, zabobony, a przy okazji przekazywał wyraźne nakazy i zakazy moralne zgodne z przykazaniami. Nakaz bycia „dobrym katolikiem” jako pewien niepisany moralny wzór zauważali już rozmówcy Fedorowskiego (Paweł Dzieżko, k. Suchowoli): *Dauniej Francuzy byli dobrymi katolikami jak my, a teraz tak papsulisie, że tylko samyje masony*. Był to powolny proces.

Obecne w etnosie przybywającym na Podlasie ze wschodu wierzenia pogańskie nie zniknęły mimo upływu setek lat. Pomalowane cienką warstwą prawosławnej farbki przetrwały w postaci szeptuch, rzucania zaklęć, mitycznych duchów czy też świętych gajów. Trwałość i koegzystencja takich wierzeń tuż obok prawosławia jest widoczna nawet dziś na Polesiu białoruskim i ukraińskim, a w szczątkowej formie w powiecie hajnowskim. Pobożność ograniczano do pełnego przestrachu mistycyzmu Cerkwi i nieodgadnionej tajemnicy Boga.

O ile na przełomie XIX i XX w. Białorusin – katolik z Sokółki, oraz Białorusin – prawosławny z Bielska dzielili podobny mużycki los niejako w opozycji do „Mazurów”, to trudno było mówić o jakiejś jedności tych dwóch grup. Cytując zapisaną przez Fedorowskiego wypowiedź (z nad Biebrzy): *Ruskije trymajuć niby zakon ad Pana Jezusa, papy ich usie żanaty i za toje nie majuć prawa ludziam dawać kamunii rukami a tylko łożeczkaju.* (…) *Nasza wiera liepsza, bo u nas piekniej u kaścieli na arganach hrajuć i śpiewajuć razam; u nas na abrazach biełyje asoby, a u cerkwi murzatyje.*

Wojna miała przynieść dodatkowe problemy. Proste społeczności wiejskie swą wiedzę o świecie czerpały z kontaktów osobistych. Najczęściej w obrębie jednej wsi, a od czasu do czasu od ludzi żyjących w promieniu kilku-kilkunastu kilometrów. Exodus, którego setną rocznicę obchodziliśmy w zeszłym roku, wywrócił tę rzeczywistość do góry nogami. Doświadczenie *bieżeństwa,* czyli przemieszczenie nieogarnionych mas ludzkich o tysiące kilometrów przy jednoczesnym trwaniu pozostałych na miejscu ugruntowało wśród mieszkańców ziem białoruskich przeświadczenie, że „my to jednak nie oni”. Nie mogła tego zmienić nawet wspólnota języka. No bo skoro MY zostajemy, a ONI wyjeżdżają „do Rosiji”, to jakże mówić tu o wspólnocie? Działo się w to w sytuacji, gdy na Sokólszczyźnie w najlepsze trwał proces przechodzenia miejscowej ludności z poziomu tutejszego – katolika na katolika – Polaka, ale była to wciąż świadomość słabo mierzalna, bardzo płytka i świeża. Obserwacja *bieżeństwa* (z bliska czy z daleka) tylko potwierdziła wśród białoruskojęzycznych katolików tę dychotomię.

A co z prawosławnymi? Po powrotach możliwa była odbudowa domów, gospodarki, tkanki ludzkiej, ale powrót do harmonii sprzed swoistego końca świata był już niemożliwy. Katolików i prawosławnych dzieliły zupełnie odmienne doświadczenia. Wraz z bałwochwalczym tumultem rewolucji, którego pokłosie przelało się na ziemie białoruskie, przyszły idee wywrotowe i buntownicze, przyniesione wraz z powracającymi a to z Moskwy, a to z Syberii, a to znowuż z Mińska. Na gruncie polityczno-religijnym doszło do zmiany pozycji prawosławnych, którzy znaleźli się w ramach katolickiego państwa polskiego. Tym samym zatrząsł się porządek rzeczy znany od przeszło stu lat, co w oralnej historii międzypokoleniowej oznaczało wyjście poza ramy porządku wiecznego.

Katolicka część białoruskiego etnosu Sokólszczyzny doznała najsilniejszych przeobrażeń już po wojnie. Katolicyzm, odczytywany wyłącznie jako oddawanie czci Bogu i podległość papieżowi, w dwudziestoleciu międzywojennym stał się instrumentem polonizacyjnym, włączającym orbitujące wokół niego grupy w ramy tej samej mesjanistycznej, pełnej martyrologii i miłości do ojczyzny, ideologii. Carat jawił się katolikom z Sokółki jeszcze nie jako wróg śmiertelny, ale „nie-nasz”, a tym samym jako obrońca ruskości we wszystkich jej przejawach. I choć „tutejszość” na Sokólszczyźnie bardzo długo była kategorią najbliższą sercu tak katolików jak i prawosławnych, to jednak owo współdzielenie losu prześladowanej mniejszości z rdzennymi Polakami („Mazurami”) wytworzyło między mieszkańcem wsi sokólskiej i Łomży przyszłą platformę porozumienia, a utrudniało ją w stosunku do prawosławnych.

Kluczowy stał się też element ciągłego strachu przed bezbożnym (od niedawna) wschodem, co w 1919 i 1920 r. stało się realnym zagrożeniem tak dla dalszego istnienia państwa polskiego, jak i dla katolików jako takich. Ponieważ na Sokólszczyźnie trudno było mówić o elicie białoruskiej, zdolnej oddziaływać na masy, a pamięć o dawnych, wspólnych zrywach uległa zatarciu, w obliczu nawały bolszewickiej z 1920 r. nie odnowiono du-

cha wspólnej walki Rzeczypospolitej Obojga Narodów z Moskalami. Tym co zostało w pamięci i co wtłoczono do państwowej propagandy po zakończonej sukcesem obronie, była raczej Polska jako przedmurze chrześcijaństwa i polskość jako jedyny gwarant przetrwania katolicyzmu. A któryż z prostaczków spod Sokółki życzyłby sobie przyjścia „końca świata" podobnego do tego, jaki spotkał ich prawosławnych sąsiadów? Nikt. Toteż warto było być Polakiem i polskim patriotą, bo tylko to gwarantowało trwanie ich Kościoła.

W największym jednak stopniu o późniejszym charakterze tutejszych relacji zadecydowała efemeryczność Białoruskiej Republiki Ludowej, gdzie białoruskich patriotów katolików bynajmniej nie brakowało. Pierwszy premier BNR Józef Woronko urodził się wszak w Kuźnicy Białostockiej, a wśród powołujących ją do krótkiego życia nie brakowało również pojedynczych mieszkańców tych stron. Po upadku tej inicjatywy przepaść między Białorusinami na Sokólszczyźnie, a tymi z Bielszczyzny, Hajnowszczyzny już tylko rosła, a nie malała. Przyjmując polską optykę prawosławni mogli poczuć się i być odbierani jak piąta kolumna wroga. Niepewna, bo do wczoraj ściśle związana z Moskwą cerkiewną nicią i z czasem coraz pełniejsza elementu wywrotowego. Czy tak było? I tak, i nie. Pawluczuk tłumaczy tę zmianę tożsamościowymi procesami, odmiennie przebiegającymi w głowach jednostek z powiatów katolickich i tych na południe od Narwi, w sposób bardzo przekonujący.


W sytuacji rozpadu dawnej unitarnej społeczności wsi, a przede wszystkim upadku autorytetów lokalnych, pewna część takiej zbiorowości szuka nowych wzorców, nowych celów i nowego sensu. Częściowo mogła i zapełniała tę pustkę nowa religia, a zatem pojawiające się w międzywojniu jak grzyby po deszczu odłamy protestanckie – adwentyści, baptyści, pomniejsze sekty. Orla, Dubicze, Michałowo – tam trafiali na podatny grunt. Częściowo zapełniała ją ostentacyjna ucieczka jeszcze bardziej do wewnątrz, a więc w samo prawosławie – jedyny pewnik w tych niepewnych czasach. Częściowo zaś ukojenie mogła przynieść idea narodowa. Ponieważ jednak emisariuszom idei białoruskiej działanie w nowym terenie, przy mocno odmiennych doświadczeniach, wyniesionych z większych miast, i różnicach językowych, przychodziło z dużym trudem, lepiej było nawiązać do czynników ekonomicznych. Stąd właśnie rosnące niemal z każdym rokiem poparcie dla Hromady i Komunistycznej Partii Zachodniej Białorusi. Walka o coś abstrakcyjnego nie mogła porwać tłumów, ale już walka o społeczną sprawiedliwość, rozumianą jako równy status materialny każdego człowieka, dawała autentyczną nadzieję. Stąd też w latach trzydziestych na Podlasiu zaroiło się od komórek KPZB.

Podczas gdy takie procesy zachodziły w powiecie bielskim i hajnowskim, katolicka ludność białoruska nie podzielała dylematów egzystencjalnych swych braci. Na Sokólszczyźnie przejście odbyło się płynnie. Ze społeczności tutejszej – zapisanej jako katolicy, ale pełnej więzi z dawnym światem, stała się wpierw jednoznacznie katolicka, by w spisach powszechnych z lat 1918-39 określać siebie już jako polska. Pustka pojawiła się na krótko i została błyskawicznie zastąpiona kultem Matki Boskiej oraz żarliwą i pełną posłuszeństwa modlitwą do Pana Jazusa. Przejście było o tyle łatwiejsze, że nikt nie kazał mużykom spod Korycina stać się nagle „Mazurami", czy przyjąć ich język. Nie było to konieczne, ponieważ także „Mazurzy", a więc polskojęzyczna ludność Łap czy Moniek, aspirowali do zjednoczonej w katolicyzmie polskości. Polskości, a więc czegoś ponad podhalańską góralszczyzną, kurpiowszczyzną, czy znowuż lokalnym, wciąż tak różnym pod względem językowym, kolorytem Dąbrowy czy Nowego Dworu.

A może w ogóle problem, nad którym się tu zastanawiamy, jest jakąś *wydumką* środowiska białoruskiego? Może, jak twierdzą dziś wyjątkowo mocno piętnujący każde nawiązanie do białoruskości, a nade wszystko coraz liczniejsi, nacjonaliści z Sokółki, mowa prosta to nie gwara białoruskiego, a tutejsi katolicy byli tak naprawdę Polakami od zawsze? Proponuję znów sięgnąć do Fedorowskiego i oddać głos samym mieszkańcom tych stron. Jan Dzieżko, Dryga: *Mazury, co za rekaju na Polszczy, czasto śmiejućsie z naszych ludziej, co chodziać u każuchu i świci i nazywajuć nas Rusinami, Kapuśniakami, ale jeny samy nie lepszyje, bo na ich nie zabaczysz innaho adzienia jak kupczo, a swaho nie wyrablajuć, bo ich kabiety hultajki*.

Tym, co pozostało jeszcze jako świadectwo dawnego pochodzenia, stały się nazwiska mieszkańców oraz właśnie język prosty. Jeszcze jedno zagranie historii – tym razem semantyczne – która dorzuciła niejeden kamyczek, by sprawę samoidentyfikacji ludności tych ziem ułatwić (utrudnić?). A cóż to znaczy „po prostu"? To znaczy po żadnemu. Prosty znaczy ubogi. Nie szła za tym żadna potencjalna wartość. Pawluczuk zauważa, że już przed wojną młodzież Sokólszczyzny starała się mówić przede wszystkim po polsku. Nie znaczy to, że nie rozumiała albo nie umiała mówić po prostemu (a mówić tak umiał również urodzony dużo później ks. Jerzy Popiełuszko), ale równała do katolików zza miedzy, czyszcząc i tak już bardzo oczyszczoną w zachodnich regionach powiatu gwarę z białorutenizmów.

Efektem było wypchnięcie jakiejkolwiek białoruskości poza świadomość mas, gdyż te tkwiły w coraz mocniej sadowiącej się polskości. Ponieważ jednak Rzeczypospolita w ówczesnych jej granicach pozwalała chcącym i ochotnym uczyć się, pracować i podróżować do Wilna czy do pobliskiego Grodna, toteż życiodajne płyny narodowego odro-



Infografika Mateusz Styrczula

dzenia płynęły w latach 20. i 30. XX w. również na Sokólszczyznę. Były to może strumyczki małe i dość wyobcowane, ale jednak dające nadzieje, że walka nie jest jeszcze stracona. To właśnie w zderzeniu z tymi centrami białoruskiego, katolickiego żywiołu rodziły się wśród tych nielicznych jednostek pytania o to, co naprawdę „rodne".

Prócz wspomnianego już premiera BNR Józefa Woronki warto wspomnieć działających w międzywojniu poetę Franciszka Hryszkiewicza z Suchowoli, księdza i działacza białoruskiego Franciszka Hrynkiewicza oraz jego brata Stanisława, a także wiele piszącego o białoruskich sprawach Dominika Aniśkę ze Słojnik. Postaci te prócz pożądanych cech przypominały jednak nie Kostusia Kalinowskiego z Mostowlan, praojca późniejszej Białorusi, prędzej pewien zaczyn, samotne jaskółki, don kichotów, przyjmowanych przez większość dość obojętnie.

Państwo polskie nie ułatwiało zadania, patrząc na język białoruski w Kościele katolickim podobnie jak dziś na język białoruski w urzędach patrzy Republika Białoruś. Wojna o dusze nie znosi kompromisów. I tu ich być nie mogło.Tyle że nawet przy tak niesprzyjających warunkach i nierównej walce o odrodzenie narodowe prawdziwa katastrofa miała dopiero nadejść. Wraz z fizyczną eliminacją elity białoruskiej w BSRR przez Józefa Stalina, II wojną światową i ponowną zmianą granic katolicka Sokólszczyzna została w 1945 r. odcięta tak od Wilna, jak i od Grodna. Nie mając już innych wzorców niż polskość, białoruskojęzyczni katolicy utracili alternatywę. Zakrawa na ironię losu, że to co ostatecznie przypieczętowało polskość na Sokólszczyźnie przyszło zatwierdzone rękami Sowietów – ruskich, których tak się obawiano. Panbiałoruski ruch w PRL, obejmujący prawosławnych i katolików, stał się od tej pory abstrakcją. Nie takie były życzenia nowych komunistycznych włodarzy Warszawy i Moskwy, zbyt wiele zaszło też w ciągu tych pięćdziesięciu lat, by można to jeszcze jakoś odwrócić. Prawosławni zostali zepchnięci do białoruskiego narożnika niejako siłą rzeczy, choć i tu udało się licznej grupie przejść do obozu Polaków-prawosławnych, ale już katolicy takich dylematów mieć nie mogli.

Rozpad społeczeństw i ich atomizacja, jaką niesie z sobą nowoczesność, każe pytać o korzenie. Jednostki, które w XXI wieku zaspokoiły pierwotne potrzeby piramidy Masłowa, dziś odkurzają stare dokumenty, grzebią w księgach parafialnych, wspominają słowa dziadków. Poszukiwania to całkiem ciekawe i kto wie, kogo w przyszłości jeszcze zaskoczą.

Mateusz Styrczula

Muzyka cerkiewna

Wzorem lat ubiegłych w maju obędą się w naszym regionie dwa festiwale muzyki cerkiewnej. Najpierw – w dniach 9-14 maja w Hajnówce – XXXV Międzynarodowy Festiwal Hajnowskie Dni Muzyki Cerkiewnej, a następnie – od 17 do 22 maja – XXXV Międzynarodowy Festiwal Muzyki Cerkiewnej „Hajnówka 2016" w Białymstoku. Obie imprezy są kontynuacją zapoczątkowanych w 1982 w Hajnówce Dni Muzyki Cerkiewnej. Spory wśród organizatorów doprowadziły do tego, że od 2002 r. organizowane są dwa festiwale.



XXXV Międzynarodowy Festiwal Hajnowskie Dni Muzyki Cerkiewnej 2016 (program)

9.05.2016

Koncert inauguracyjny w wykonaniu Chóru Studentów Moskiewskiego Konserwatorium Narodowego im. Piotra Czajkowskiego, godz.18.00, sobór Świętej Trójcy w Hajnówce

Przesłuchania konkursowe (w soborze Świętej Trójcy w Hajnówce, pocz. o godz. 15.00)

10.05.2016

1. Chór parafii prawosławnej Ścięcia Głowy Jana Chrzciciela w Szczytach (Polska)
2. Chór „Aksios", Synkowicze (Białoruś)
3. Chór parafii prawosławnej św. Archanioła Michała w Orli, (Polska)
4. Chór parafii prawosławnej Wniebowstąpienia Pańskiego w Nowoberezowie (Polska)
5. Chór parafii prawosławnej Narodzenia Najświętszej Marii Panny, Bielsk Podlaski (Polska)
6. Chór „Harmoń", Łosinka (Polska)
7. Dziecięco-młodzieżowy chór „Błahowiest" szkoły niedzielnej soboru św. Szymona Słupnika w Brześciu (Białoruś)

11.05.2016

1. Chór parafii prawosławnej Narodzenia św. Jana Chrzciciela w Hajnówce (Polska)
2. Chór parafii Świętego Wielkomęczennika Jerzego Zwycięzcy w Białymstoku (Polska)
3. Chór parafii prawosławnej św. Mikołaja, Irpień (Ukraina)
4. Reprezentacyjny chór „Kupalinka" Dziecięcej Szkoły Sztuki w Kobryniu (Białoruś)
5. Chór „Dołgij wieczer", Hajnówka (Polska)
6. Chór Duchowieństwa Diecezji Białostocko-Gdańskiej, Białystok (Polska)
7. Młodzieżowy Chór „Wisson", Mińsk (Białoruś)

12.05.2016

1. Chór parafii prawosławnej Świętych Apostołów Piotra i Pawła, Siemiatycze (Polska)
2. Chór „Ferchisa", Tbilisi (Gruzja)
3. Katedralny chór soboru Świętej Trójcy, Hajnówka (Polska)
4. Chór dziecięco-młodzieżowy „Polifonia" Politechniki Białostockiej, Białystok (Polska)
5. Kwintet „Preobrażenije", Żytomierz (Ukraina)
6. Chór „Gieorgielebi", Tbilisi (Gruzja)
7. Chór „Polifonia" Politechniki Białostockiej, Białystok (Polska)
8. Zespół wokalny „Pokrow", Kijów (Ukraina)

13.05.2016

1. Studencki akademicki chór „Junist", Sumy (Ukraina)
2. Chór „Freska", Mińsk (Białoruś)
3. Chór katedry Opieki Matki Bożej, Grodno (Białoruś)
4. Chór soboru Zmartwychwstania Pańskiego, Brześć (Białoruś)
5. Chór „Aletheia" parafii prawosławnej Świętych Apostołów Piotra i Pawła w Jassach (Rumunia)
6. Dziecięco-młodzieżowy chłopięcy chór „Cantus", Moskwa (Rosja)
7. Chór kameralny „Błahowiest", Ryga (Łotwa)
8. Chór kameralny Filharmonii Państwowej w Astrachaniu (Rosja)
9. Akademicki chór studentów Charkowskiej Państwowej Akademii Kultury, Charków (Ukraina)

Koncert Plenerowy „Uczta Folklorystyczna" w Ośrodku Edukacji Leśnej „Jagiellońskie" Białowieża (Żwirownia), godz. 20.30

14.05.2016

godz.13.00 – ogłoszenie wyników, Hajnowski Dom Kultury
godz.15.00 – Koncert galowy w soborze Świetej Trójcy w Hajnówce (ul. Ks. Dziewiatowskiego 15)
godz.18.00 – Koncert galowy w cerkwi Hagia Sophia w Białymstoku (ul. Trawiasta 5)

w dwóch odsłonach



XXXV Międzynarodowy Festiwal Muzyki Cerkiewnej „Hajnówka 2016" (program)

Inauguracja – 17 maja 2016, godz. 19.00
(Opera i Filharmonia Podlaska, Białystok, ul. Podleśna 2)

Koncert inauguracyjny ***„Muzyka cerkiewna – od źródeł do współczesności"*** w wykonaniu **Chóru Narodowego Radia Ukrainy im. P. Majborody** pod dyr. Julii Tkacz

Przesłuchania konkursowe
(Opera i Filharmonia Podlaska, Białystok, ul. Podleśna 2)

19.05.2016, godz. 17.00

1. Chór psalmistów staroobrzędowych parafii w Jekabpiłs i Rydze (Łotwa)
2. Chór „Św. Zlata Meglenska" – Skopje (Macedonia)
3. Chór Diecezji Koszyckiej – Poráč (Słowacja)
4. Chór prawosławnego soboru św. Tomasza (Zjednoczone Emiraty Arabskie)
5. Chór „Prieobrażenije"– Borisow (Białoruś)
6. Chór Diecezji Australijsko-Nowozelandzkiej – Sydney (Australia)
7. Chór Młodzieżowego Domu Kultury – Białystok (Polska)
8. Chór „Cantus Juventae" Państwowego Uniwersytetu Lingwistycznego – Mińsk (Białoruś)
9. Ukraiński Chór Męski „Żurawli" – Warszawa (Polska)
10. Chór Akademii Muzycznej „Gaudeamus" – Płovdiv (Bułgaria)

20.05.2016, godz. 17.00

1. Dziewczęcy Chór „Wohnyk" – Kijów (Ukraina)
2. Wzorcowy Chór Chłopięcy – Swietłogorsk (Białoruś)
3. Dziecięcy Chór „Raduga" – Tallin (Estonia)
4. Chór Dziecięcej Kapełły Chóralnej – Wielikij Nowgorod (Rosja)
5. Dziecięcy Chór Radia i Telewizji Litwy – Wilno (Litwa)
6. Chór „Radost`" – Moskwa (Rosja)
7. Chór parafii grekokatolickiej – Vranov (Słowacja)
8. Chór „Św. Stefan z Decani" – Nowi Sad (Serbia)
9. Chór Bułgarskiej Akademii Nauk – Sofia (Bułgaria)
10. Chór Politechniki Świętokrzyskiej – Kielce (Polska)
11. Chór Politechniki Gdańskiej – Gdańsk (Polska)
12. Kowieński Chór „Kamertonas" – Kowno (Litwa)

21.05.2016, godz. 15.00

1. Chór „Modo Maiorum" – Warszawa (Polska)
2. Chór Państwowego Koledżu Muzycznego – Grodno (Białoruś)
3. Chór Uczelni Muzycznej im. S. Broka – Daugavpils (Łotwa)
4. Chór Państwowej Wyższej Uczelni Muzycznej „Soniacznyj Strum" – Nikołajew (Ukraina)
5. Chór Rosyjskiej Akademii Muzyki im. Gniesinych – Moskwa (Rosja)
6. Bizantyjski Chór „Domestikoi of Drama" – Drama (Grecja)
7. Państwowy Chór Kameralny Białorusi – Mińsk (Białoruś)
8. Bizantyjski Zespół Męski „Św. Efraim" – Budapeszt (Węgry)
9. Chór Kameralny „Legenda" – Drohobycz (Ukraina)
10. Państwowy Chór „Preludiu" Narodowego Centrum Sztuki Rumunii – Bukareszt (Rumunia)
11. Państwowy Moskiewski Chór Kameralny – Moskwa (Rosja)

Zakończenie festiwalu
22.05.2016 (Opera i Filharmonia Podlaska, Białystok, ul. Podleśna 2)

godz. 14.00 – Ogłoszenie werdyktu jury i wręczenie nagród
godz. 16.00 – Koncert galowy



Na koncercie inauguracyjnym XXXV Międzynarodowego Festiwalu Muzyki Cerkiewnej „Hajnówka 2016" w Białymstoku zaśpiewa Chór Narodowego Radia Ukrainy im. P. Majborody pod dyr. Julii Tkacz – laureat I miejsca w kategorii chórów zawodowych 34. edycji festiwalu

Незвычайная рэканструкцыя

Драўляны макет царскага палацу ў Белавежы, выкананы народным майстрам з Нараўкі, Раманам Маліноўскім, з красавіка г.г. прэзентуецца ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы. Вось некалькі здымкаў з экспазіцыі.

(Чытайце таксама на стар. 52)










Фота Тамаша Ціханюка
Архіўныя здмкі з: radzima.org



Календарыюм

Травень – гадоў таму

900 – у 1116 г. нашэсьце на землі Дрыгавічоў і Крывічоў дружын кіеўскага князя Уладзіміра Манамаха. Захопнікі здабылі ды разбурылі, між іншым, Друцак, дзе ўсё насельніцтва захапілі ў няволю і загналі на засяленьне паўднёвай Кіеўшчыны.

570 – у 1446 г. быў складзены Беларуска-літоўскі летапіс – першы агульны летапісны збор старабеларускай дзяржавы, які дайшоў да нашых дзён.

475 – у 1541 г. быў створаны паляўнічы запаведнік у Белавежскай пушчы.

380 – 16.05.1636 г. уніяцкае духавенства Бельска з дапамогай польскіх войскаў зьдзейсьніла пагром праваслаўных храмаў у гэтым горадзе.

330 – 16.05.1686 г. быў падпісаны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай „вечны мір”. Расія атрымала Смаленшчыну, Чарнігаўшчыну ды Кіеўшчыну.

330 – у 1686 г. у Зьверках каля Заблудава ў праваслаўнай беларускай сям’і Пятра і Анастасіі Гаўдзеляў нарадзілася немаўлятка Гаўрыіл, замучаны 3 траўня 1690 г. у Беластоку. Кананізаваны праваслаўнай царквой. Ягоныя мошчы знаходзяцца ў саборы сьв. Мікалая ў Беластоку.

255 – 6.05.1761 г. у в. Ясенцы, Лідзкага павету нар. Станіслаў Юндзіл, адзін зь першых дасьледчыкаў флёры й фаўны ў Беларусі.

250 – у 1766 г. беларуская праваслаўная шляхта Случчыны ўтварыла канфедэрацыю, якая дамагалася поўнага ўраўнаньня ў правах з каталіцкай шляхтай.

250 – у 1766 г. у Вялікім Княстве Літоўскім была ўведзена адзіная сістэма мераў і вагаў.

225 – 3.05.1791 г. польскі сойм прыняў канстытуцыю (Ustawa Rządowa), паводле якой была зьнесена аўтаномія Вялікага Княства Літоўскага.

175 – 21.05.1841 г. у Парыжы памёр Юльян Урсын Нямцэвіч (нар. 16.02.1758 г. у Скоках пад Бярэсьцем), удзельнік паўстаньня Т. Касьцюшкі ў 1794 г. і лістападаўскага паўстаньня 1830-1831 гг., паэт, пісьменьнік, мэмуарыст.

135 – 28.05.1881 г. у Шаўлях, Ковенскай губэрні нар. Іван Луцкевіч (пам. 20.08.1919 г. у Закапанэ), выдатны нацыянальны дзеяч, археоляг, этнограф. Выпускнік Маскоўскага ды Пецярбурскага Унівэрсытэтаў. Галоўны стваральнік Цэнтральнага Камітэту Беларускай Сацыялістычнай Грамады, суарганізатар ды член рэдакцыі „Нашай Долі” ды „Нашай Нівы”, заснавальнік Беларускай Віленскай Гімназіі ды Беларускага Музэя ў Вільні.

110 – 1.05.1906 г. у Гародні нар. Аляксандра Бэргман (сапр. Хава Кучкоўская), дзеячка КПЗБ, аўтарка артыкулаў пра беларускі нацыянальны рух і яго дзеячаў, кніг „Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu” (Warszawa 1977) і „Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej” (Warszawa 1984), «Слова пра Браніслава Тарашкевіча» (Мінск 1996). У 1935-1945 гг. адбывала ссылку ў гулагах Сібіры як «вораг народу». Пасьля вайны жыла ў Варшаве, дзе памерла 20.06.2005 г. Пахавана на яўрэйскіх могілках у Варшаве.

110 – 18.05.1906 г. у Пецярбургу паўстала беларуская выдавецкая суполка „Загляне сонца і ў нашэ ваконцэ” (праіснавала да 1914 г.). Выдала 38 кніг на беларускай мове агульным накладам больш за 100 тысяч асобнікаў.

90 – 6.05.1926 г. памёр у Вільні Казімір Сваяк (кс. Кастанты Стэповіч), сьвятар, грамадзка-нацыянальны дзеяч, паэт (нар. 19.02.1890 г. у в. Барані Сьвянцянскага павету). Пахаваны ў Вільні на Росах.

90 – 26.05.1926 г. пачало дзейнічаць у БССР Беларускае Літаратурнае Аб’яднаньне „Узвышша”.

85 – 1.05.1931 г. у Слоніме нар. Алег Лойка, паэт, вучоны, пэдагог. Памёр 19.11.2008 г. у Слоніме.

85 – 15.05.1931 г. памёр у Варшаве Леон Пэтражыцкі (нар. 13.04.1867 г. на Віцебшчыне), вядомы праваавед, сацыёляг.

85 – 17.05.1931 г. памёр у турме у Маскве мітрапаліт менскі й беларускі Мелхісэдэк (Міхаіл Паеўскі, нар. У 1878 г. у в. Вітулін непадалёк Белай-Падляшскай, Сядлецкай

губэрні). Быў актыўным прыхільнікам абвяшчэньня Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы.
80 – у траўні 1936 г. выйшаў у Вільні з друку першы нумар грамадзка-палітычнага часопіса, месячніка „Беларускі Фронт". Выданьне цьвёрда прытрымлівалася беларускіх нацыянальных інтарэсаў. Найважнейшую ролю ў ім адыгрывалі кс. Вінцэнт Гадлеўскі, Лявон Вітан-Дубейкаўскі, Мікалай Шкялёнак, Вацлаў Папуцэвіч. Выданьне праіснавала да 1939 г.
80 – 15.05.1936 г. у Вялікім Бары Хойніцкага раёна нар. Барыс Сачанка (пам 5.07.1995 г. у Менску), пісьменьнік, перакладчык з сэрбскай, славацкай, польскай моваў. Адкрывальнік і выдавец літаратурнай спадчыны Беларусаў з цэлага сьвету.
70 – 23.05.1946 г. памёр у менскай турме Кастусь Езавітаў (нар. 17.11.1893 г. у Дзьвінску), нацыянальна-грамадзкі дзеяч, публіцыст, настаўнік. З 1917 г. прымаў актыўны ўдзел у стварэньні беларускага войска. У лютым 1918 г. стаў камэндантам Менску й менскай акругі. Быў членам Рады БНР. З 1921 г. жыў у Рызе. У час нямецкай акупацыі ўзначаліў Беларускае Нацыянальнае Аб'яднаньне ў Рызе. У красавіку 1945 г. затрыманы савецкімі войскамі ў Бэрліне.
55 – 20.05.1961 г. памёр у Варшаве беларускі нацыянальны дзеяч, прадпрымальнік Язэп Гапановіч (нар.10.06.1883 г. у Будславе).
45 – 15.05.1971 г. адкрыцьцё у Лёндане беларускай бібліятэкі й музэя ім. Францішка Скарыны – беларускага грамадзка-культурнага асяродка.
35 – у траўні 1981 г. быў заснаваны арганізацыйны камітэт Беларускага Аб'яднаньня Студэнтаў у Польшчы. 30 траўня 1981 г. 45 членаў-заснавальнікаў накіравала ліст у Міністэрства навукі, вышэйшага школьніцтва і тэхнікі ПНР, дамагаючыся рэгістрацыі арганізацыі.
30 – 16.05.1986 г. у Гародні быў адкрыты Дом-Музэй Максіма Багдановіча.
25 – у днях 25-27.05.1991 г. у Менску праходзіў І Міжнародны Кангрэс Беларусістаў.

Апрацавалі **Лена Глагоўская** і **Вячаслаў Харужы**

Калісь пісалі

Хрыстос Ўваскрос.

Хрыстос Уваскрос! Якая сладасьць
Павінна ў сэрцы нашым быць!
Ці-ж ні вялікая нам радасьць!
Хрыстос Уваскрос! І будзе жыць!
Хрыстос Уваскрос! Як міла слухаць!
Сяньня брат брату й руку жме
Ды ў пацалунку сваю чуласьць
Яму ён з сэрца аддае.
Хрыстос Уваскрос! І ў нас, далёка
Ад Вашых ветлых, мілых хат,
І ў сэрцы чуем мы глыбока,
Што звоніць родны дзесь набат.
Хрыстос Уваскрос! Віншую, брацьця,
Славамі чыстымі, сьвятымі.
Хай там, у кожнай роднай хаце,
Яны Вам будуць дарагімі!

Янка Невук.
„Да злучэньня", 1933, № 4(16), с. 4

Хрыстос ускрос!

Хрыстос ускрос! Хрыстос ускрос!
На цэлы сьвет гудзе так звон.
Надзею нам ў душу прынёс,
Стаптаўшы зло на векі Ён.

Хрыстос ускрос, хоць жыў як Бог –
Навука так яго рачэ. –
На сьвеце цьму разсеяў – змог
І праўда ўсім людзям цячэ.

Хрыстос ускрос для нас – людзей,
Каб даць нам знак, што сам Ён – Бог,
Што любіць нас – сваіх дзяцей,
Падняўшы ўсіх з пад цемры ног.

Хрыстос ускрос за волю ўсіх,
Каб зьдзек людзей прапаў на век,
Каб кожны на'т і з тых "малых"
Зрабіўся-б роўны чалаевек.

Для нас Ён также ўваскрос,
Каб мы таксама аджылі.
Свабоду Ён і нам прынёс,
Каб вольным людам мы былі.

Хрыстос ускрос – гудзяць званы,
А рэха хвалямі плыве,
І радасьць ўсім нясуць яны,
Што праўда Божая жыве.

А ў звоне тым я чую тон:
„Чаму Крывіч яшчэ ня ўскрос?
Ў яго краю чуецца стогн
І мора там плыве ад сьлёз."

О Божа наш, збудзі Ты нас,
Ўскрасі Ты край стаптаны той,
Дзе вораг злу знайшоў папас
І мучыць усьцяж нядоляй злой.

Марвіч
„Шлях Моладзі" 1930, № 4, с. 2

„Вялікдзень”.
(Паводле Раманава).

„Вялікдзень”, альбо іначай „Вялікадня” лічыцца ў нас, беларусаў, як і ў іншых славянскіх народаў, найбольшым сьвятам. Па вёсках гэтае сьвята цягнецца цэлы тыдзень, які так і завецца „Вялікодным”.

Падгатоўка да сьвятаў пачынаецца з серады апошняга тыдня вялікага посту. Мыюць абразы, беляць сьцены, наогул чысьцяць усё. Дзеля гэтага ўвесь тыдзень завецца „чыстым”. У народзе так і кажуць „Чысты чацьвер, чыстая серада” і г. д.

Адначасна з чысткаю, гаспадыні рыхтуюць закускі. Самае галоўнае, гэта пякуць булкі з пшанічнае мукі. Гэтая булка завецца „Паска”.

Апрача „паскі” – абавязкова павінны быць: чорны хлеб з сольлю, сыр, кусок сала і яйкі. Калі гаспадар багацейшы, дык шынка, парася, курыца і г.д. Сьвянціць у царкву, альбо касьцёл, нясуць паску, кусок сала, альбо мяса, сыр і яйкі. Усё гэта завязваюць у чыстую хустку, альбо абрусікі, падчас абраду запальваюць сьвечкі.

У 12 гадзін, калі пачынаецца набажэнства і крэсны ход у царквах, страляюць з стрэльбаў, альбо пушчаюць ракеты, у той час, як засьпяваюць „Хрыстос Воскрэсе”. У некаторых мясцох – пасьля таго, як гаспадар прыходзіць з царквы дамоў, адно яйко абавязкова апушчаюць у ваду, катораю потым усе мыюцца, а яйкам гладзяць твар, каб быць здаровымі і „чырвонымі” ўвесь год. Пачынаюць разгаўляцца так. Старшы з сям’і рэжа яйкі на столькі кавалкаў, колькі чалавек у сям’і і раздае кожнаму па кавалку, якія зьядаюць з сольлю. Потым ядуць сыр, альбо тварог з сьмятанаю, паску, сала і нарэшце мяса. Разгавеўшыся, кладуцца абавязкова спаць, але перад гэтым выходзяць глядзець, як „граець сонца”, бо ў народзе пераконаны, што на „Вялікдзень” сонца таксама радуецца і ўсходзіць іначай, ніж у звычайныя дні.

Выспаўшыся, ідуць на вуліцу, альбо пад царкву ці касьцёл і там граюць у яйкі. Чыё яйко мацнейшае – той „выбіваець” і забіраець выбітае яйко сабе. Пры гэтым бываець і ашуканства. Даюць „каштаваць” – пастукаць у зубы – звычайнае яйко, але потым спрытна замяняюць яго „заліванкамі”, у каторых насок заліты воскам, альбо гіпсам. Гульня з яйкамі цягнецца ўвесь вялікодны твдзень. Пры спатканьні цалуюцца тры разы з знаёмымі, а на першы дзень і з кожным сустрэчным.

У царквах – „царскія вароты” адчынены, а ў народзе вераць, што на Вялікдзень цэлы тыдзень адчынены вароты ў „сьветлы рай” і „хто памірае, той шчасьлівы”, бо пападаець у рай бяз ніякіх перашкодаў. Ёсьць і легенды. Адна з іх кажа, што Хрыстос ад першага дня Вялікадня аж да Вазьнясеньня хадзіў па зямлі і заходзіў у госьці да бедных, няшчасных людзей. На першы і на другі дзень Вялікадня маладыя хлапцы і дзяўчаты ходзяць увечары „хрыстосаваць” і сьпяваюць пры гэтым пад вокнамі, альбо ў хаце розныя песьні.

„Хрыстосаўнікам”, альбо як іх называюць „валачобнікам” даюць паску, сала і яйкі.

Даўней „валачобнікі” хадзілі па 15 чалавек. Адзін з іх лічыўся „пачынальнікам”. Ён сьпяваў усю песьню. Рэшта за кожным ягоным вершам дадавала: „Хрыстос Уваскрос Сын Божы”, альбо „А зялён явар кудравы!” „А зялёны сад вішнёвы!” „А віно-ж наша зеленое!” Часам з „валачобнікамі” хадзіў музыка са скрыпкаю, які акомпаньяваў усяму хору і „механоша”, які насіў зьбіраныя яйкі і закускі.

Назьбіраўшы закусак, хлопцы куплялі гарэлкі і пачыналі гуляць. Калі гарэлкі было зашмат, дык гульня гэтая часта канчалася ня зусім спакойна. Цяпер „валачобнікі” ходзяць дзе-ня-дзе, а заместа іх сьпяваюць валачобныя песьні маладыя хлопчыкі і дзяўчаты.

Чацьвер па Вялікодным тыдні называецца „Вялікдзень памёршых”. У гэты дзень варыцца лепшы абед, малююць сьвежыя яйкі і па абедзе ходзяць на могілкі. Там моляцца за памёршых, а яйкі альбо зарываюць у зямлю, альбо раздаюць бедным.

Вялікодныя сьвяты канчаюцца „Радаўніцаю”, якая бывае ў аўторак на другі тыдзень пасьля „Вялікадня”. У гэты дзень варыцца багаты абед і ўся сям’я ідзе на могілкі ў госьці да памёршых. Пасьля набажэнства п’юць і ядуць усё тое, што прынесена з дому і назад нічога не нясуць, а калі што застанецца, раздаюць бедным. Слова „Радаўніца” паходзіць ад слова „радавацца”. Народ верыць, што ў гэты дзень усе памёршыя радуюцца з Уваскрэсеньня Хрыста.

Вялікодныя сьвяты ня толькі хрысьціянскія сьвяты, але і глыбокая народная традыцыя, якая перайшла да нас ад продкаў, калі славяне ня былі яшчэ хрысьціянамі, а спраўлялі паганскія сьвяты вясны і адраджэньня прыроды.

Вось чаму ў вялікодных песьнях і асабліва ў песьнях валачобнікаў шмат засталося пэражыткаў гэтага старадаўняга, паганскага сьвята, сьвята Вясны.

Падаў В.

„Беларускі Дзень”, № 8, 24.04.1927 г., с. 2-3

Валакаднікі

Слова гэтае, у мясцовасьці (у Баброўні – заўвага Л. Глагоўскай), дзе я прыйшоў на гэты сьвет, азначае тое самае, што ў літэратурнай нашай мове ды ў большасьці беларускіх мясцовасьцяў – валачобнікі.

Ад гэтага слова мае землякі стварылі й дзеяслоў, датарнованы да самога дзеяньня валакаднікаў, і кажуць, што яны ходзяць валакаць або валокаць.

Вось і прышло мне на думку падзяліцца з чытачамі „Бел. Дня” тым, што засталося ў маёй памяці ад беспасярэдняга бачаньня вялікоднага валаканьня або валачобнічаньня ў роднай вёсцы за пэўны пэрыяд з некалькіх гадоў да вялікай вайны.

У вельмі маладыя гады, бо маючы толькі 16 гадоў веку, я пакінуў сваю вёску і, модна кажучы, пачаў пролетарызавацца на розных канцэлярскіх службах, займаючыся па магчымасьці самаадукацыяй ды папісваючы ў газэтах. Апошнія два гады перад вайною прабыў вясковым настаўнікам ў Сакольшчыне, але кожны Вялікдзень, аж да самага 1914 году стараўся прыяжджаць у родную вёску і быць там сьведкаю старадаўнага беларускага нашага звычаю – валаканьня.

Вучонымі дасьледжана, што звычай гэты зусім і нехрысьціянскага нават паходжаньня: ён у нас вядзецца з невядомых паганскіх часоў. Аднак у мае дзіцячыя гады, – гэта я добра помню, – хрысьціянскія мамэнты неяк перакрыжоўваліся з старадаўнімі паганскімі, бо валакаднікі пялі, як песьні аб Уваскрасеньні Хрыста, так і зусім сьвецкія песьні, аб характары якіх пагаворым ніжэй.

Дый што там капацца ў досьледах вучоных? Самое-ж сьвята, калі адбываюцца пад вокнамі нашых сялянскіх хатаў гучныя песьні валакаднікаў, і дасюль яшчэ завецца беларусамі ня йначай, як – Вялікдзень. Праўда, сярод каталікоў-беларусаў я чуў, як завуць яны гэтае сьвята пакасьцельнаму і папольску – Wielkanoc.

Ну, але не бяда: каму дзень, а каму ноч, досіць таго, што сьвята гэтае народ наш лічыць вялікім.

Вось-жа ў гэта вялікае народнае сьвята, на першы дзень яго, і хадзілі па вёсках мае роднае мясцовасьці валакаднікі, як іх там завуць.

Дарэчы сказаць і вёскі там у нас, у лясной глушы горадзенскага павету, вакол і ў нетрах азёрнага лясьніцтва! Якіх толькі назоў яны ня маюць: Баброўня, Вострава, Полымя, Сіні-Камень, Шкленск, Ашуркі, Нівішча, Шчанец, а з іншага боку, у бязьлеснай мясцовасьці: Бандары, Лішчыцы, Стральцы, Канюхі, Галавачы, Асошнікі (або Карашава–казённае), Белякоўшчына, Карашавапанскае, фальварак князя Сьвятаполк-Чацьвяртынскага з дзівачным назовам – Фенкава, хіба ад расейскага якога імя Феня (Тахвіля)!

І вось увесь хіба ўжо раён, па якім з вёскі ў вёску, ад хаты да хаты, уночы з першага на другі дзень Вялікадня, хадзілі ў нас валакаднікі, канчаючы свае валачобныя сьпевы ў сваёй вёсцы, а пачынаючы з суседніх вёсак, поводле свайго выбару. Валакалі хлопцы і дзяўчаты, разам складаючы саматужны вясковы хор, часамі вельмі складны, які сапраўды прыемна было паслухаць.

А калі дадаць да гэтага, што валакаднікі найчасьцей забіралі з сабою і сваіх вясковых музыкаў, пяючы пад скрыпку, а часам і разам з гармонікам (бубен цягаў хтонібудзь з дзяцюкоў пад пахаю не для сьпеваў, а ўжо зусім для іншай мэты), дык можна сабе ўявіць, дзеля чаго валакалі? А проста для самае веселасьці, якую нават і сама зямля-маці выказвала, будзячыся ад нуднага зімовага сну.

Што-ж пялі нашыя валакаднікі? І як яны калісь валакалі?

З раньніх сваіх дзіцячых гадоў я памятаю, што ўсё гэта мела пэўны свой шаблён.

Пад вакно бацькавай (ну, пэўна-ж і матчынай!) хаты падходзіла кампанія моладзі з якой-нібудзь суседняй вёскі, як толькі пачынала, як там у нас кажуць, шарэць і адзін з хлапцоў тройчы голасна вітаў парасейску:

– Хрыстос воскрес?

Гасьцінны гаспадар, ці проста хто-нібудзь з хатніх, таксама тройчы адказваў:

– Воистину воскрес!

Пачуўшы гэтыя адказы, прадстаўнік валакаднікаў ужо зусім пэўным тонам заяўляў пабеларуску:

– Пане гаспадару, пазвольце дом развесяліць.

– Весялеце, весялеце, – адказваў гаспадар з хаты.

Калі валакаднік, які пытаўся пазваленьня, быў добры гаспадароў знаёмы, напр. з свае вёскі, дык пазваленьне часам давалася і ў жартоўнай форме:

– Весялі, весялі, толькі хаты не развалі...

Адмаўляць валакаднікам лічылася ганьбаю для гаспадара і яны заўсёды галасілі пад вокнамі да самае раніцы, зьмяняючы адны адных, партыя за партыяй. Іншы раз чулася ў вёсцы некалькі песьняў адразу пад вокнамі некалькіх хатаў...

Калі цэрамонія пазваленьня канчалася, дык музыкі пачыналі мотыў вялікоднае песьні, хор дружна падхапляў і песьня лілася добрае з паўгадзіны, трасучы, у гэту сапраўды вялікую для вёскі ноч, яе вечную цішу і адбіваючыся магутным рэхам у ваколічным, блізенькім лесе за соннаю Котраю – ракою.

У мае дзіцячыя гады (апошні дзесяткі XIX сталецьця) сьпявалася, відочна вуніяй занесеная да нас, песьня, якую я няраз бачыў ў польскай кантычцы, быўшай у хаце праваслаўных бацькоў:

Wesoły nam dziś dzień nastał,
Którego z nas każdy żądał –
Alleluja, Alleluja, Alleluja!

І неяк толькі пасьля 1905-6 гадоў першы раз нашая вёска ад валакаднікаў пачула:

Ходил Христос по всей земле
Христос-Воскрес, Сын Божы!
Искал Христос Свае Маці,
Христос Воскрес, Сын Божы!
А знайшоўшы – стал пытаці,
Христос Воскрес, Сын Божы!...

Песьня была гэткаю навіною, што прынёсшых яе валакаднікаў проста замучылі, просячы паўтараць, за што іх пасьля шчодра дарылі.

Словы гэтай песьні ня былі чыста расейскімі, яна была так моцна зьбеларушчана, што пачынаючы з словаў „Сын Божы”, і іншых, вымаўляных так, як яны ў мяне тут напісаны, мела і шмат цікавых родных зваротаў.

Русіфікацыя Беларусі пайшла мацнейшым тэмпам пасьля першае, няўдачнае, праўда, расейскае рэвалюцыі і гэта дало сябе чуць у песьнях валакаднікаў, якія

з тае пары аж да самага 1914 году пяялі звычайна замест польскае – рускую песьню. Пасьля гэтае песьні пяялі яшчэ царкоўны „тропарь”: „Христос воскресе из мертвых”. А пасьля песьні аб Хрысьце адбывалася віншаваньне, якое ў нас перакручвалі на свой капыл у – імшаваньне.

Адзін з валакаднікаў на немагчыма благой польскай мове віншаваў гаспадара, выказваючы яму самыя найлепшыя пажаданьні.

Валакаднікі добра ведалі, ў якой хаце ёсьць дзяўчына-падростак, ці нават такая, што ўжо не адны сваты ў яе безрэзультатна пабывалі.

У кожным выпадку яны датарноўваліся, як кажуць, да абстаноўкі і, згодна з апошняю, пяялі – „Вербу”.

Вербаю або вярбою звалася ўжо зусім сьвецкая песьня валакаднікаў, якая бярэ свой пачатак недзе ў глыбокай паганскай нашай мінуўшчыне. Пазваленьне (пасьля віншаваньня) сьпяваць яе выпрашвалася ўжо куды з меншай цэрамоніяй і сьпявалася яна з гэткімі ўстаўкамі, імпровізованымі, як я казаў, згодна з абстаноўкаю, тут-жа якім нібудзь дзяцюком-запявайлам, што дзівіцца толькі трэ’ было колькі ў нашых вясковых масах ёсьць самародкаў-паэтаў!

З гэтай пасьняю моладзь зьвярталася ўжо не да сур’ёзнага гаспадара з усім яго домам, а толькі да яго дачушкі і чулася, як той казаў, у сваёй роднай стыхіі.

Так! у роднай стыхіі. Бо „вярба” – гэта ўжо песьня і няпольская і няруская, а наша родная – беларуская.

Гэткаю я яе чуў апошні раз у 1914 годзе. Ой, як я быўбы ўдзячны таму, хто даў-бы мне ўзор поўнага тэксту гэтае песьні! І надоўга неадкладаючы, карыстаю з гэтых вось радкоў, зьвяртаючыся да ўсіх сваіх землякоў і наагул да нашае вясковае інтэлігенцыі з вялікаю просьбаю, запісаць яе са словаў каго-нібудзь з цяперашніх ужо дзядзькоў, быўшых валакаднікаў, і прысласць на адрэс „Беларускага Дня”.

У мяне ў памяці застаўся ні то самы канец, ні то штосьблізкае да яго, з гэтае песьні.

Вось ён:

А пайдзем мы на грудочак,
Да віно-ж, віно зелено.
Дый пасядзем у радочак,
Да віно-ж, віно зелено.
Будзем яйкі разьлічаці,
Да віно-ж, віно зелено.
Будзем паненку выхваляці,
Да віно-ж, віно зелено.

Трэба зазначыць, што валакаднікам дарылі за іхнія песьні яйкі, якімі яны пасьля дзяліліся або закусвалі імі гарэлку на агульных ігрышчах.

Варта запісаць песьню, якую у маёй роднай мясцовасьці завуць „вярбою”. Яна – сьведка несьмяротнасьці нашае нацыянальнае культуры ў найцяжэйшых гістарычных акалічнасьцях.

Варта яе запісаць у кожнай мясцовасьці, як яна пяецца і як яе завуць.

Няўжэ-ж мы – дзеці часу нашага беларускага адраджэньня – дапусьцімся да таго, каб родная песьня загінула бяз сьледу?

Раней мне даводзілася чуць „вербу”, сьпяваную ў нас і папольску, але з тым самым прыпевам.

Пасьля „вярбы”, паненцы гаварылася ў нас таксама віншаваньне, але... папольску.

Як валакаюць у нас цяпер – сказаць не бяруся, бо з 1914 г. ніводнага Вялікадня мне не ўдалося правясьці ў родным кутку, дзе гэтак страшэнна шмат чаго зьмянілася.

Краўцоў Макар
„Беларускі Дзень”, № 8, 24.04.1927 г., с. 6-10

„Wialikdzień”

Białoruskie zwyczaje wielkanocne

Wielkanoc po białorusku nazywa się „Wialikdzień”. „Wialikdzień”, sądząc z pieśni i niektórych obrzędów wywodzi się jeszcze z cyklu pogańskich świąt wiosennych. Toteż wypada zastanowić się nad ich całokształtem. Miłość do wiosny z jej darami musiała być u plemion białoruskich wielką. Świadczy o tym kazanie prawosławnego patrona Białorusi św. Cyryla z Turowa (XII w.), w którym kaznodzieja dał w formie poetyckiej wyraz temu kultowi.

